# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

## 1 верасня 1939 г. Германія

Урок
90 хвілін

Дадатковы матэрыял

Першакрыніцы

## Выступ Адольфа Гітлера перад рэйхстагам з нагоды падзей 1 верасня 1939 г.

### Члены парламента! Дэпутаты германскага рэйхстага!

На працягу доўгага часу мы пакутавалі ад жудаснай праблемы, праблемы, створанай Версальскай дамовай – дакладней, Версальскім дыктатам. Ад праблемы, якая пагаршалася, пакуль не стала невыноснай для нас. Данцыг быў – і ёсць германскім горадам. «Калідор» быў – і ёсць германскі. Гэтыя тэрыторыі абавязаны сваім культурным развіццём выключна нямецкаму народу. Без нямецкага народа на ўсіх гэтых усходніх тэрыторыях будзе квітнець самае цёмнае варварства. [...]

Польшча разгарнула барацьбу супраць Вольнага горада Данцыга. Больш за тое, Польшча не была гатовая ўрэгуляваць праблему «калідора» справядлівым спосабам, выконваючы інтарэсы абодвух бакоў, і не думала аб захаванні сваіх абавязацельстваў аб павазе да правоў нацменшасцей.

Я павінны заявіць вызначана: Германія выконвае свае абавязацельствы; нацменшасці, якія пражываюць у Германскім рэйху, не пераследуюцца. Ніводны француз не можа ўстаць і заявіць, што 50 000 або 100 000 французаў, якія пражываюць у Саарскай вобласці, прыгнечаныя, закатаваныя або пазбаўленыя сваіх правоў. Ніхто не можа сказаць такога. [...]

І, такім чынам, я прыняў зараз рашэнне весці размову з Польшчай на той жа мове, на якой яна размаўляе з намі ўжо шмат месяцаў! Калі дзяржаўныя дзеячы на Захадзе заяўляюць, што гэта ідзе насуперак іх інтарэсам, я толькі магу шкадаваць пра такія заявы, але гэта не можа ні на імгненне спыніць мяне ў выкананні майго доўгу.

Чаго яшчэ яны хочуць ад нас? Я ўрачыста запэўніў іх, і я паўтару: мы нічога не просім ад заходніх дзяржаў і ніколі не папросім. Я абвясціў, што мяжа паміж Францыяй і Германіяй – канчатковая. Я неаднаразова прапаноўваў Англіі сяброўства і, пры неабходнасці, самае блізкае супрацоўніцтва, але такія прапановы не могуць быць аднабаковымі; яны павінны знайсці водгук у іншага боку. [...]

Я асабліва шчаслівы, што магу паведаміць вам адну навіну. Вы ведаеце, што ў Расіі і Германіі – розныя дзяржаўныя дактрыны. Гэтае пытанне – адзінае, якое трэба было растлумачыць. Германія не збіраецца экспартаваць сваю дактрыну. Улічваючы той факт, што і Савецкая Расія не мае намер экспартаваць сваю дактрыну ў Германію, я не бачу ніводнай прычыны для супрацьстаяння паміж намі. Гэтае меркаванне падзяляюць абодва нашы бакі: любое супрацьстаянне паміж нашымі народамі будзе выгадна толькі іншым. Таму мы вырашылі заключыць дамову, якая назаўсёды ліквідуе магчымасць якога-небудзь канфлікту паміж намі. Гэты дагавор накладае на нас абавязак раіцца адзін з адным пры вырашэнні пэўных еўрапейскіх пытанняў, а таксама дае магчымасці для эканамічнага супрацоўніцтва і, перш за ўсё, дае ўпэўненасць, што нашы дзве вялікія і магутныя дзяржавы не стануць залежнымі або ўзаемна выключальнымі. Любая спроба Захаду перашкодзіць нам зазнае няўдачу. У той жа час я хачу заявіць, што гэтае палітычнае рашэнне мае вялікае значэнне для будучыні, і гэтае рашэнне – канчатковае. Я веру, што ўвесь нямецкі народ ухваліць маю палітычную пазіцыю. Не варта забываць, што Расія і Германія змагаліся адна супраць адной у Першай сусветнай вайне і абедзве ў выніку пацярпелі. Гэта не павінна паўтарыцца, і не паўторыцца ў другі раз. [...]

Сёння ноччу Польшча ўпершыню адкрыла стральбу на нашай тэрыторыі і нават накіравала кадравых вайскоўцаў. З 5.45 раніцы мы адказваем агнём! Цяпер жа бомбам мы супрацьпаставім бомбы! На выкарыстанне баявых газаў мы адкажам выкарыстаннем баявых газаў! Той, хто адыдзе ад правіл вядзення гуманнай вайны, хай не чакае ад нас гуманнасці. Я буду працягваць барацьбу супраць усіх, пакуль не будуць забяспечаныя бяспека Рэйха і ягоныя правы. [...]

Як нацыянал-сацыяліст і як нямецкі салдат, я ўступаю ў гэтую барацьбу з непахісным сэрцам. Усё маё жыццё – толькі бясконцая барацьба ў імя майго народа, для яго адраджэння і ў імя Германіі. Быў толькі адзін лозунг у гэтай барацьбе – вера ў гэты народ. Адно слова мне ніколі не было знаёмае – здацца. [...]

Я гатовы ў любы момант аддаць сваё жыццё – няхай яго забярэ любы! – за мой народ і за Германію, і таго ж я патрабую ад кожнага. Ну а той, хто думае, што ён зможа прама ці ўскосна супрацьстаяць гэтаму запавету для нацыі, – той зазнае крах! Здраднікаў чакае смерць! [...]

Я таксама чакаю, што нашы нямецкія жанчыны стануць прыкладам жалезнай дысцыпліны ў гэтай вялікай грамадзе, а нямецкая моладзь з усім полымем сэрца выканае тое, чаго ад яе чакаюць і патрабуюць нацыя і нацыянал-сацыялістычная дзяржава.

Калі мы створым такую згуртаваную супольнасць, якая мае намер зрабіць усё і поўная рашучасці ніколі не здавацца, мы пераадолеем усе складанасці моцай нашай волі. [...]

Германіі – зіг хайль! Няхай жыве Перамога!

691 слова